Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

# ВАЖНЕЙШЫЯ ДАСЯГНЕННІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ НАВУКОВАЙ БІБЛІЯТЭКІ НАН БЕЛАРУСІ

## *Найбольш знакавыя распрацоўкі і дасягненні*

Дзейнасць Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей – ЦНБ НАН Беларусі) ажыццяўляецца па наступных напрамках: задавальненне інфармацыйных патрэбаў вучоных, спецыялістаў і правядзенне навуковых даследаванняў у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, гісторыі кнігі, інфармацыйнай дзейнасці і бібліяметрыі. Супрацоўнікі бібліятэкі забяспечваюць бягучае і рэтраспектыўнае камплектаванне фондаў бібліятэкі айчыннымі і замежнымі дакументамі на розных носьбітах інфармацыі; удзельнічаюць у фармаванні Зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі; арганізуюць доступ да айчынных і замежных электронных рэсурсаў для супрацоўнікаў устаноў НАН Беларусі; ствараюць электронныя паўнатэкставыя копіі дакументаў, якія захоўваюцца ў фондах, з наступным прадастаўленнем іх у адкрыты доступ; праводзяць бібліяметрычныя даследаванні публікацыйнай актыўнасці вучоных і ўстаноў Рэспублікі Беларусь па даных міжнародных навукаметрычных сістэм.

У 2021 г. рэалізавана новая схема арганізацыі прадастаўлення аддаленага доступу да навуковых электронных рэсурсаў – ліцэнзійных баз даных вядучых сусветных навуковых выдавецтваў з дапамогай выкарыстання проксі-сервера OCLC EZProxy, а таксама распачаты працэс рэалізацыі прадастаўлення федэратыўнага доступу праз федэрацыю FEBAS.

18 лістапада было падпісана пагадненне з Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці аб стварэнні Цэнтра



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

падтрымкі тэхналогій і інавацый (ЦПТІ) на базе бібліятэкі. Асноўная мэта ЦПТІ – нарошчванне інавацыйнага патэнцыялу ў Рэспубліцы Беларусь праз забеспячэнне інфармацыйнай і навукова-метадычнай падтрымкі карыстальнікаў у сферы навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці.

### *Вынікі фундаментальных даследаванняў у межах падпраграмы*

У 2021 г. у ЦНБ НАН Беларусі ажыццяўлялася работа па двух навукова-даследчых праектах.

Завершана навукова-даследчая работа **«Гісторыя навукі ў эга-дакументах Інстытута беларускай культуры (1922–1928)»** (дагавор з БРФФД № Г19-026, навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, дацэнт А. І. Груша, выканаўцы – В. Г. Мазец, М. В. Глеб, К. В. Сыцько), вынікам якой з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы ўжытак новага тыпу крыніцы – эга-дакументаў вучоных Інбелкульта. Гэтыя дакументы дазваляюць вызначыць сацыякультурны і палітычны фон дзейнасці Інбелкульта, індывідуальныя і групавыя погляды, інтарэсы, памкненні, стратэгіі, чаканні і настроі, і нават мысліцельныя (разумовыя) і эмацыйныя рэакцыі яе супрацоўнікаў у зменлівых абставінах, якія датычыліся культурнага і навуковага развіцця Беларусі ў перыяд рэалізацыі ключавых задач нацыянальнага і сацыяльнага пераўтварэння краіны.

Канчатковы вынік праекта – рукапіс зборніка дакументаў «Гісторыя навукі ў эга-тэкстах Інстытута беларускай культуры (1922–1928 гг.)». Пры падрыхтоўцы зборніка распрацавана метадалогія працы з эга-дакументамі і прынцыпы іх археаграфічнай апрацоўкі.

Зборнік уключае 108 дакументаў. Па відавым складзе – гэта лісты, заявы, запіскі, прапановы, паведамленні, перапіска, хадайніцтвы, даклады, водгукі, меркаванні, справаздачы, характарыстыкі, аўтабіяграфіі і рэзюмэ. Дакументы адлюстроўваюць тэматыку, якая датычыцца пытанняў аб структуры, арганізацыі працы, юрыдычным статусе, скла-



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

дзе і напрамках дзейнасці Інбелкульта, навуковых і культурных сувязях, планах навуковай працы, падрыхтоўцы навуковых і вучэбных выданняў на беларускай мове, справаздач аб навуковай дзейнасці, публікацыі навуковых прац, абмене выданнямі, навуковых камандзіроўках, залічэнні ў аспірантуру, патрабаваннях, якія прад'яўляюцца маладым і вопытным вучоным, і інш.

Распачата праца па праекце **«Узроўні і формы самаідэнтыфікацыі дзеячаў навукі і культуры Беларусі XIX–XX стст.»** (дагавор з БРФФД № Г21-110, навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, дацэнт А. І. Груша, выканаўцы – К. В. Сыцько, А. Л. Кіштымаў), мэтай якога з'яўляецца вызначэнне вытокаў і этапаў фарміравання, спосабаў выбудоўвання і форм праяўлення асобаснай, сацыяльнай і грамадзянскай самаідэнтыфікацыі дзеячаў навукі і культуры XIX–XX стст. – выхадцаў з Беларусі.

Праца вялася па двух этапах: «Вывучэнне гістарыяграфіі аб дзеячах навукі і культуры Беларусі XIX ст.», «Вывучэнне гістарыяграфіі аб дзеячах навукі і культуры Беларусі XX ст.».

У межах першага этапу вывучалася гістарыяграфія, прысвечаная Ігнату Дамейку (1802–1889), Іосіфу Гашкевічу (1814–1875), Бенядыкту Дыбоўскаму (1833–1930), Зыгмунту Мінейку (1840–1925), Зыгмунту Фларэнцыю Урублеўскаму (1845–1888) і Яну Чэрскаму (1845–1892). У межах другога этапа – Яўхіму Карскаму (1860–1931), Мітрафану Доўнару-Запольскаму (1867–1934), Аляксандру Чыжэўскаму (1867–1964), Паўлу Сухому (1895–1975), Вячаславу Сцёпіну (1934–2018), Міхаілу Высоцкаму (1928–2013), Жарэсу Алфёраву (1930–2019) і інш.

### ***Важнейшыя публікацыі***

На працягу 2021 г. ЦНБ НАН Беларусі вяла актыўную выдавецкую дзейнасць. Выдавецкая прадукцыя бібліятэкі – манаграфіі, бібліяграфічныя паказальнікі, даведачныя



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

і інфармацыйныя выданні, каталогі і факсімільныя выданні з фондаў бібліятэкі. Па выніках года выйшлі з друку 7 кніжных выданняў.

Апублікавана манаграфія Ф. Д. Падбярозкіна *«“Кніга хронік” Хартмана Шэдэля (1493) – энцыклапедыя Позняга сярэднявечча»*[1]. У выданні разглядаецца гісторыя стварэння «Кнігі хронік», яе змест, гістарыяграфія. Прадстаўлены вынікі даследавання экзэмпляра кнігі з фонду бібліятэкі, электронная копія якога размешчана на кампакт-дыску.

Пабачыў свет зборнік артыкулаў, прысвечаны Францыску Скарыну, ураджэнцу Полацка, доктару медыцыны, першадрукару Вялікага Княства Літоўскага, перакладчыку і выдаўцу Бібліі, пісьменніку[2]. Сярод задач зборніка – прасоўванне наватарскіх, прадуктыўных, неардынарных і смелых ідэй у вывучэнні асобы, дзейнасці і спадчыны Скарыны. Апублікаваныя тэксты змяшчаюць новыя факты, меркаванні, інтэрпрэтацыі, палажэнні і высновы. У зборніку выдадзены працы вучоных з Беларусі, Літвы, Украіны, Чэхіі і Францыі.

Выдадзены *зборнік навуковых артыкулаў «Беркаўскія чытанні. Кніжная культура ў кантэксце міжнародных кантактаў»*[3]. Цыкл канферэнцый «Беркаўскія чытанні», заснаваны ў гонар вядомага кнігазнаўцы і філолага,

---

[1] Подберёзкин Ф. Д. «Книга хроник» Хартмана Шеделя (1493) – энциклопедия Позднего средневековья / Ф. Д. Подберёзкин ; редкол.: А. И. Груша (гл. ред.) [и др.] ; ред. библиогр. записей И. Л. Мурашова ; Центр. науч. б-ка имени Якуба Коласа. – Минск : Беларус. навука, 2021. – 87 с. : ил. + 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

[2] Францыск Скарына: даўнія факты – новыя ідэі / Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа Нац. акад. навук Беларусі ; уклад. А. Груша ; рэдкал.: А. І. Груша [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2021. – 159 с.

[3] Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов, 2021 = Berkovskye Chteniya. Book culture in the context of International contacts, 2021 : материалы VI Междунар. науч. конф., Гродно, 26–27 мая 2021 / Междунар. ассоц. акад. наук, Науч. совет по книгоизд. [и др. ; сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина ; редкол.: Л. А. Авгуль и др. ; библиогр. ред. О. В. Пирогова]. – Минск : ЦНБ НАН Беларуси ; М. : ФГБУН НИЦ «Наука» РАН, 2021. – 714 с.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

члена-карэспандэнта АН СССР П. Н. Беркава, працягвае VI Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беркаўскія чытанні. Кніжная культура ў кантэксце міжнародных кантактаў» (папярэднія прайшлі ў 2011, 2013, 2015, 2017, 2019 гг.), прымеркаваная да 125-годдзя з дня нараджэння вучонага.

Пабачылі свет *матэрыялы XIV Беларуска-Расійскага навуковага семінара «Сучасныя праблемы кніжнай культуры: асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця»*[1]. У зборніку, прысвечаным памяці члена-карэспандэнта РАН У. І. Васільева, прадстаўлены артыкулы вучоных з Беларусі, Расіі, Чэхіі, Францыі і Азербайджана, у якіх разглядаюцца розныя аспекты вывучэння кніжнай культуры, а таксама праблемы бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі ва ўмовах лічбавізацыі грамадства.

Па выніках праведзенай XII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых вучоных і спецыялістаў *«Бібліятэка ў XXI стагоддзі: новыя выклікі»* (24–25 лютага 2021 г.) падрыхтаваны і выдадзены на дыску зборнік навуковых артыкулаў[2]. У зборніку прадстаўлены даклады маладых вучоных і спецыялістаў, якія адлюстроўваюць актуальныя пытанні бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання з прымяненнем новых інфармацыйных тэхналогій,

---

[1] Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития = Modern Problems of Book Culture: Main Tendencies and Prospects : материалы XIV Белорус.-Рос. науч. семинара-конф., Москва, 24–25 нояб. 2021 г. / Междунар. ассоц. акад. наук, Науч. совет по кн. культуре, книгоизд. и б-кам [и др. ; сост.: Л. А. Авгуль, Н. В. Вдовина ; редкол.: А. И. Груша (сопред.), Н. В. Вдовина (сопред.) [и др.] ; библиогр. ред. О. В. Пирогова]. – Минск : ЦНБ НАН Беларуси ; М. : ФГБУН НИЦ «Наука» РАН, 2021. – 564 с.

[2] Библиотека в XXI веке: новые вызовы = Library in the XXI century: new challenges [Электронный ресурс] : материалы XII Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 24–25 февр. 2021 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; ред. М. М. Лис ; пер. на англ. О. Н. Чикун ; редкол.: Л. А. Авгуль (отв. ред.) [и др.] ; библиогр. ред. О. В. Пирогова ; рец.: В. А. Касап, Р. Б. Григянец. – Электрон. дан. – Минск : Ковчег, 2021. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк, прафесійнай адукацыі, навукова-даследчай работы, у тым ліку вывучэння помнікаў кніжнай культуры. Падрыхтаваны і выдадзены альбом[1] і дыск[2], прысвечаныя НАН Беларусі. Прадстаўлена візуалізацыя часткі дакументальнай спадчыны са збораў устаноў НАН Беларусі – Цэнтральнага навуковага архіва і ЦНБ НАН Беларусі, якая адлюстроўвае гісторыю Акадэміі з моманту заснавання да 1990 г. Гістарычныя дакументы раскрываюць бягучыя задачы і паўсядзённую дзейнасць НАН Беларусі, у якіх рэалізоўваліся яе арыенціры, устаноўкі і патэнцыял.




Выданні ЦНБ НАН Беларусі ў 2021 г.

[1] Нацыянальная акадэмія навук Беларусі: гісторыя ў дакументах (1929–1990) = National Academy of Sciences of Belarus : history in documents (1929–1990) / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; уклад.: А. І. Груша [і інш.] ; тэкст анат.: М. У. Глеб, Д. А. Крэнт, К. В. Сыцько ; падрыхт. і апрац. іл.: В. А. Варонкіна [і інш.] ; пер. на англ. мову: М. У. Глеб, В. М. Чыкун. – Мінск : Беларус. навука, 2021. – 138, [2] с. : іл.

[2] Нацыянальная акадэмія навук Беларусі: гісторыя ў дакументах (1929–1990) = National Academy of Sciences of Belarus : history in documents (1929–1990) [Электронны рэсурс] / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; уклад.: А. І. Груша [і інш.]. – Электрон. тэкст. даныя і выявы (139 Мб). – Мінск : Беларус. навука, 2021. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM) : цв. ; 12 см.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

За справаздачны перыяд апублікаваны 104 навуковыя артыкулы, у тым ліку 7 – у часопісах і зборніках, якія рэцэнзуюцца; 10 навукова-папулярных артыкулаў.

### *Важнейшыя навукова-практычныя мерапрыемствы*

24–25 лютага ў бібліятэцы прайшла *XII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных і спецыялістаў «Бібліятэка ў XXI стагоддзі: новыя выклікі»*, арганізаваная сумесна з факультэтам інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ і Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй. У гэтым годзе канферэнцыя была прысвечана дэтэрмінантам развіцця бібліятэк у кантэксце сучасных сацыяльна-камунікатыўных працэсаў, уплыву працэсу лічбавай трансфармацыі на бібліятэчна-інфармацыйную адукацыю.



XII Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных і спецыялістаў «Бібліятэка ў XXI стагоддзі: новыя выклікі»



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by







VI Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беркаўскія чытанні. Кніжная культура ў кантэксце міжнародных кантактаў»

26–27 мая ў Гродне адбылася *VI Міжнародная навуковая канферэнцыя «Беркаўскія чытанні. Кніжная культура ў кантэксце міжнародных кантактаў»*, якая прайшла пад эгідай МААН. Арганізатарамі форуму выступілі Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі, УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», ФДБУ навукі «Навуковы і выдавецкі цэнтр “Навука” Расійскай акадэміі навук», Навуковая рада па кніжнай культуры, кнігавыданні і бібліятэках МААН, Навуковая рада Расійскай акадэміі навук «Гісторыя сусветнай культуры».

24–25 лістапада ў Маскве пад эгідай МААН і Навуковай рады па кніжнай культуры адбыўся *XIV Беларуска-Расійскі навуковы семінар-канферэнцыя «Сучасныя праблемы кніжнай культуры: Асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця».* Арганізатарамі мерапрыемства сталі Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі, Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі, ФДБУ навукі «Навуковы і выдавецкі цэнтр “Навука” Расійскай акадэміі навук».



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



XIV Беларуска-Расійскі навуковы семінар-канферэнцыя
«Сучасныя праблемы кніжнай культуры:
Асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця»

Бібліятэка стала суарганізатарам *XX Міжнароднай канферэнцыі «Развіццё інфарматызацыі і дзяржаўнай сістэмы навукова-тэхнічнай інфармацыі (РІНТІ-2021)»*, якая адбылася 18 лістапада.

22 снежня ў Маскве ў фармаце анлайн-трансляцыі прайшоў *Расійска-Беларускі круглы стол «Грані кніжнай культуры»* (да 20-годдзя стварэння Навуковага цэнтра “Навука” Расійскай акадэміі навук), арганізатарамі якога выступілі вышэйзгаданы Цэнтр і Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі.

У рамках дзейнасці філіяла кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ быў праведзены *навукова-практычны семінар «Абслугоўванне карыстальнікаў навуковай бібліятэкі»* і два *круглыя сталы: «Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у дзейнасці бібліятэк», «Інавацыі ў абслугоўванні карыстальнікаў бібліятэк».*



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by



Расійска-Беларускі круглы стол «Грані кніжнай культуры»

### *Навуковыя праекты, папулярызацыя і практычнае выкарыстанне вынікаў даследаванняў*

ЦНБ НАН Беларусі быў створаны *віртуальны праект «Інбелкульт: 100 гадоў з часу заснавання»*[1], прысвечаны 100-годдзю Інстытута беларускай культуры (1922–1928) – першай вышэйшай навуковай установы ў найноўшай гісторыі Беларусі, на аснове якой была створана Беларуская акадэмія навук. Мэта праекта – прадаставіць у адкрыты доступ лічбавую калекцыю яго выданняў, якія захоўваюцца ў фондах бібліятэкі.

Бібліятэка працягвае працу па публікацыі матэрыялаў у сацыяльнай сетцы Facebook для падтрымання віртуальнага праекта «Колас у сэрцы», прысвечанага народнаму паэту Беларусі, акадэміку, віцэ-прэзідэнту АН БССР Якубу Коласу.

[1] Інбелкульт: 100 гадоў з часу заснавання [Электронны рэсурс] // ЦНБ им. Я. Коласа НАН Беларуси. – URL: https://csl.bas-net.by/inbelcult/ (дата звароту: 13.04.2022).



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Папаўняецца кантэнт *рэсурсу «Віртуальны мемарыяльны кабінет П. Ф. Глебкі ЦНБ НАН Беларусі»*[1], створанага ў сувязі са 115-годдзем з дня нараджэння акадэміка П. Ф. Глебкі. На сайце даступная інфармацыя пра яго жыццё і творчасць, бібліятэку, прадстаўлены фотадакументы, бібліяграфія прац П. Ф. Глебкі і кнігі пра яго, медыятэка і інш.

Працягваецца папаўненне размешчанай на сайце бібліятэкі *БД «Нацыянальная акадэмія навук у СМІ»*[2], якая ўключае больш за 43 тыс. поўных тэкстаў публікацый у газетах, часопісах, інтэрнэт-рэсурсах, звязаных з НАН Беларусі.

ЦНБ НАН Беларусі – адна з удзельніц *навукова-папулярнага праекта пад адкрытым небам «Фестываль навукі»*, які адбыўся 11 верасня ў Цэнтральным батанічным садзе. Супрацоўнікі падрыхтавалі для гасцей Фестывалю сямейную пляцоўку «Аранжарэя ведаў», адбылася інтэрактыўная кніжная выстаўка «Усё пра ўсё».

Бібліятэка ажыццяўляе сваю дзейнасць у розных напрамках, у тым ліку і ў арганізацыі мерапрыемстваў для вучняў і студэнтаў: 13 мая для вучняў гімназіі № 30 супрацоўнікі падрыхтавалі *літаратурна-адукацыйную праграму «Хто жыве ў Беларусі»*, прымеркаваную да Года народнага адзінства; 1 чэрвеня ЦНБ НАН Беларусі наведалі ўдзельнікі летняй адукацыйнай школы для навучэнскай моладзі «Першыя крокі ў навуку – 2021»; 8 верасня была праведзена *міжвузаўская студэнцкая інтэлектуальная гульня «ЛаврУМ»*, прымеркаваная да Фестывалю навукі.

На працягу 2021 г. ЦНБ НАН Беларусі і яе бібліятэкі пры арганізацыях, падпарадкаваных НАН Беларусі, ажыццяўлялі актыўную выставачную дзейнасць. У 2021 г. было

[1] Віртуальны мемарыяльны кабінет П. Ф. Глебкі ЦНБ НАН Беларусі [Электронны рэсурс] // ЦНБ им. Я. Коласа НАН Беларуси. – URL: https://csl.bas-net.by/libglebka/ (дата звароту: 13.04.2022).

[2] Национальная академия наук Беларуси в СМИ [Электронны рэсурс] // ЦНБ им. Я. Коласа НАН Беларуси. – URL: http://csl.bas-net.by/Web/Press/press.asp (дата звароту: 13.04.2022).



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

арганізавана 445 выставак літаратуры, у тым ліку 146 тэматычных.

Шэраг мерапрыемстваў быў падрыхтаваны і праведзены да Дня беларускай навукі, Міжнароднага дня роднай мовы і іншых знамянальных дат гісторыі, навукі і культуры Беларусі.

Старшы навуковы супрацоўнік аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў К. В. Сыцько стаў лаўрэатам прэміі РАН і НАН Беларусі за 2021 г. у галіне сацыяльных і гуманітарных навук за калектыўны праект беларускіх і расійскіх вучоных «Жыццё і дзсйнасць акадэміка Я. Ф. Карскага (1860–1931). Навуковая спадчына ў архіўных дакументах» (сумесна з супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі М. У. Глеб, С. А. Траццяком, а таксама супрацоўнікамі Санкт-Пецярбургскага філіяла Архіва РАН Л. Д. Бондарам, К. Г. Шышкінай, М. В. Панікароўскай).

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by